❑ АКЦЫІ

# "Чытаем верш па-беларуску"



Алена ГАРМЕЛЬ Валерый КАРОЛЬ (фота)

**Так называецца акцыя, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 5 мая ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М.Горкага яе пачаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар.**

Сутнасць акцыі ў тым, што вядомыя і паважаныя жыхары горада над Бугам прачытаюць школьнікам свой любімы верш беларускага аўтара на тэму Вялікай Айчыннай вайны і паразмаўляюць пра значнасць гэтай падзеі. Галоўная мэта - абудзіць у падрастаючага пакалення жаданне ведаць і паважаць гісторыю, культуру, мову сваёй Радзімы.

Як заўважыў Канстанцін Андрэевіч, хутка мы бузем адзначаць Дзень Перамогі, які закранае практычна кожную сям'ю, бо падчас вайны загінуў кожны чацвёрты беларус. У 1964 годзе вядомы паэт Пятрусь Броўка напісаў верш "Крэпасць над Бугам", і менавіта яго старшыня Брэсцкага аблвыканкама прачытаў першым слухачам патрыятычнай акцыі. Твор, прысвечаны тым, хто "першымі клалі шляхі перамогі", не пакінуў абыякавых. Некаторыя школьнікі, не стрымаўшы пачуццяў, таксама працытавалі свае любімыя паэтычныя радкі вядомых беларускіх паэтаў. Дарэчы, спецыяльна да гэтай акцыі абласная бібліятэка падрыхтавала разгорнутую кніжную выставу "Дарагая сэрцу кніга пра вайну", прысвяціўшы адзін з раздзелаў менавіта тэме Брэсцкай крэпасці. Таксама ўдзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з выставай-партрэтам "Героі Брэстчыны", што прадстаўляе Герояў Савецкага Саюза, якія тут нарадзіліся. Гаворка не абмежавалася толькі тэмай вайны і Вялікай Перамогі. Школьнікаў, напрыклад, цікавіла, кім Канстанцін Сумар марыў стаць у дзяцінстве.

- Я нарадзіўся ў вёсцы, наша сям'я была звязана з працай у калгасе, таму я хацеў застацца на зямлі, стаць старшынёй калгаса. І гэтая мара здзейснілася, - шчыра адказаў Канстанін Андрэевіч. - Я працаваў аграномам, галоўным аграномам, намеснікам старшыні, а пасля і старшынёй калгаса "Рассвет".

Што датычыць пытання, з чаго павінна пачынацца любоў да Радзімы, губернатар Брэсцкай вобласці адказаў: з сям'і. Бацькі павінны расказваць дзецям пра той куточак, дзе яны нарадзіліся, паказваць ім хараство свайго краю, знаёміць з яго багатай гісторыяй.

7 мая эстафету чытанняў прыме пракурор Брэсцкай вобласці Іван Наскевіч.